УДК 37(476)(091)“13-14”

# “ЛІЦВІНСКІ КАЛЕГІЎМ” ПРЫ ПРАЖСКАЙ АКАДЭМІІ Ў КАНЦЫ XIV – ПАЧАТКУ XV ст.

**Самусік Андрэй Фёдаравіч**
Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт (г. Мінск, Беларусь)

У артыкуле аналізуецца спроба каралевы Ядвігі стварыць пры Пражскай акадэміі асветнага асяродка для ўраджэнцаў ВКЛ. Адзначаны яе захады на гэты конт ды іх рэалізацыя, вядомыя мясцовыя студэнты-ліцвіны, а таксама прычыны, якія перашкодзілі складванню ўстойлівай традыцыі навучання тут айчыннай моладзі.

Крэўская ўнія 1385 г. і звязанае з ёй стварэнне праз два гады Віленскага каталіцкага біскупства акрамя іншага сваім вынікам мелі і пачатак карэнных змен у развіцці айчыннай адукацыі. Адкрытая напрыканцы XIV ст. у сталіцы ВКЛ кафедральная школа першай у краіне была арганізавана на прынцыпах вывучэння “сямі вызваленых навук”, а значыць з’яўлялася своеасаблівымі “дзвярыма” для мясцовай моладзі ў свет заходнееўрапейскай адукацыі – яе выхаванцы засвойвалі лацінскую мову ў аб’ёме дастатковым для далейшай вучобы за мяжой [1, с. 88–89].

У суседняй Польшчы найбольшай папулярнасцю карысталася Карлава акадэмія ў Празе (1348), бо аналагічная ўстанова ў Кракаве (1364) пасля смерці яе заснавальніка караля Казіміра III Вялікага (1370) прыйшла ў заняпад. Не дзіўна таму тое, што для падрыхтоўкі святарскіх кадраў для ВКЛ была абрана Чэхія. Каралева Ядвіга па ўласных словах: “правяла шмат бяссонных начэй, думаючы пра тое… каб сярод ліцвінаў, якія прагнуць навукі, заззяла… святло цноты і каталіцкай веры…”. У выніку, яна дамовілася з каралём Чэхіі Вацлавам IV аб утварэнні пры тэалагічным факультэце Пражскай акадэміі калегіўма для ліцвінскай моладзі: “дзе слава Хрыстова і навука найбольш удзячна квітнеюць”. Адпаведны Акт аб яго заснаванні быў падпісаны каралевай у Кракаве 10 снежня 1397 г. Згодна яму яна ахвяравала 12 тыс. пражскіх грошаў (200 коп). На іх быў набыты жылы дом у Празе і в. Грушова. На ўтрыманне 12 студэнтаў-ліцвінаў штогод меркавалася выдаткоўваць 4 капы грошаў, яшчэ 8 копаў грошаў ішло кожны год на аплату працы магістра. Чэшскі манарх пацвердзіў яго 20 ліпеня наступнага года. Ён падкрэсліваў, што заўсёды імкнуўся: “Каб святло каталіцкай веры распаўсюджвалася па ўсёй зямлі, каб людзі, асветленыя ім, пакінуўшы пустыню памылак, былі шчасліва скіраваны на шлях праўды…”, а таму загадваў: “Каб ніхто не адважваўся чыніць ніякіх перашкодаў куплі такога дому і зямельнага маёнтку…”, якія вызваляліся ім ад усялякіх падаткаў ды павіннасцяў [2, с. 385–388].

Адметна, што каралева Ядвіга прызначыла апекунамі свайго фундуша ўласнага надворнага канцлера і спавядальніка Я. Шчэкну (чэх; прыбыў у Кракаў у другой палове 1390-х гг.), а таксама двух пражан – нейкага Ныяпрона ды К. Кржыжа. Цалкам верагодна, што апошні з’яўляўся сваяком Я. Кржыжа, на зямлі якога на Віфлеемскай плошчы ў Старым горадзе ў 1390-я гг. была ўзведзена капліца ў гонар Віфлеемскіх немаўлят (нявінна забітых пасля нараджэння Ісуса). Ускос-



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

ным пацверджаннем гэтага з’яўляецца тое, што тутэйшы прапаведнік (у 1402–1413 гг. гэту пасаду займаў тагачасны рэктар акадэміі Я. Гус), адпаведна лісту натарыуса Пражскай акадэміі ад 29 красавіка 1411 г., разам са згаданымі вышэй апекунамі даваў уласную згоду на залічэнне ліцвінаў у калегіўм ды найм магістра [3, с. 230–231].

Кароль Вацлаў IV адкрыта апекаваў гусітаў і напэўна пераканаў у іх праваце Ядвігу, з якой у яго былі самыя прыхільныя адносіны (у згаданай вышэй грамаце называў яе “найпрыгажэйшай польскай каралевай” і “сястрой”, а яна яго – “сваім найдаражэйшым братам”, хоць блізкіх сваяцкіх сувязяў паміж імі не было). Аднак, ініцыянаванае Я. Гусам пры падтрымцы ўлад пераўтварэнне Пражскай акадэміі ў нацыянальную навучальную ўстанову з акцэнтам на доказ легітымнасці яго вучэння. У 1409 г. у Пражскай акадэміі нават адбыўся канфлікт паміж мясцовымі ды замежнымі студэнтамі, а таксама прафесарамі. Кароль Вацлаў IV аддаў перавагу ў рашэнні ўнутраных пытанняў суайчыннікам, што прывяло да сыходу каля 800 замежных выхаванцаў у суседні Лейпцыг, дзе з гэтай нагоды быў арганізаваны ўніверсітэт. Гэтыя падзеі не прыйшліся да спадобы кансерватыўнаму грамадству ВКЛ, якое толькі пачало прызвычайвацца да пашырэння ў краіне каталіцызму і не жадала апускацца ў нетры заблытаных тэалагічных дыскусій. Як след, адпраўляцца на вучобу ў Прагу жадаючых практычна не знаходзілася [4, с. 30–35].

Сведчыць аб гэтым ужо згаданы ліст акадэмічнага натарыуса 1411 г., дзе між іншым ён запытвае, што рабіць з нерэалізаванымі 48 капамі грошаў, прызначанымі на ўтрыманне студэнтаў з ВКЛ. Пры ўмове, што фінансаванне пачалося з 1398 г. і ў складеным вясною дакуменце натарыус улічыў сродкі за бягучы год – агульная сума выдаткаваных фінансаў не магла перавышаць 56 копаў грошаў, а значыць, што сваіх атрымальнікаў знайшло не больш за 8 копаў грошаў (14,3% ад агульнай сумы) ці 24 гадавых стыпендыі. Пры гэтым, тэрмін навучання да ступені бакалаўра складаў часцей за ўсё 2-4 гады, а яшчэ да 4 год патрабавалася на падрыхтоўку да экзамена на магістра. У матрыкулах юрыдычнага факультэта зафіксаваны нейкі Фама з “Lutovia” (1401), але прыпісаны ён да “багемскай (чэшскай) нацыі”, хоць з 1372 г. тут мелася і згуртаванне “польскай нацыі” [5, с. 49, 85]. Што ж датычыцца факультэта філасофіі, то ў яго матрыкулах маюцца звесткі толькі аб асобах, атрымаўшых навуковыя дыпломы. Згодна ім за 1399-1408 гг. ступені бакалаўраў былі нададзены 4 ліцвінам, з якіх адзін стаў магістрам: Міхаіл з “Lutouia” (1399), Хрыстафор з “Lytwania” (1401), Марк з “Luthouia” (1404), Мацей з Вільны (1404; 1408) [6, с. 343, 367, 379, 382, 397]. Апошні – 30-гадовы віленскі канонік – у далейшым адправіўся ў падарожжа па Італіі. У 1408 г. на пасаду рэктара ўніверсітэта ў італьянскай Сіене абралі Мацея з Польшчы, што робіць верагодным знаходжанне ў згаданай навучальнай установе менавіта пражскага магістра. У. Пшыялгоўскі сцвярджае, што ён таксама пабываў у Кракаўскай акадэміі, дзе стаў доктарам тэалогіі, але доказаў гэтаму няма. Пасля ж вяртання на Радзіму Мацей у 1417 г. быў абраны біскупам жамойцкім, а ў 1422 г. заняў пасаду біскупа віленскага, на якой, дарэчы, змагаўся супраць прыхільнікаў гусітаў у ВКЛ [7, с. 41–42, 45–48].

У цэлым, відавочна, што надзеі каралевы Ядвігі наконт навучання ў Пражскай акадэміі выхадцаў з ВКЛ у поўнай меры аказаліся не рэалізаванымі. Асноўная



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

прычына гэтага крыецца ў страце ёй у дадзены час статуса міжнароднага адукацыйнага асяродка ды пераўтварэння ў адзін з вядучых цэнтраў гусіцкага руху, які з-за свайго канфлікту з папскай курыяй успрымаўся ў якасці небяспечнай ерасі. Да таго ж, Кракаўская акадэмія з пачатку XV ст. стала агульнапрызнаным цэнтрам універсітэцкай навукі, які прывабліваў моладзь з усяго свету – у тым ліку і ліцвінаў.

## Літаратура

1. Kraszewski, J.I. Wilno : od początkow jego do roku 1750 : w 4 t. / J.I. Kraszewski. – Wilno : Nakł. i drukiem J. Zawadzkiego, 1840–1842. – T. 4. – 1842. – XVI, 408 s.

2. Malinowski, M., Kollegium dla Litwinow w Pradze. Zakład krolowej Jadwigi / M. Malinowski // Dzieje dobroczynnosci krajowej i zagranicznej z wiadomosciami ku wydoskonaleniu jej służącymi. – Wilno : Typ. J. Zawadskiego, 1923. – R. III. – T. 1. – № 4. – S. 384–388.

3. Голенченко, Г.Я. Студенты Великого княжества Литовского в Краковском университете XV–XVI вв. / Г.Я. Голенченко // Культурные связи народов Восточной Европы в XVI веке / под ред. Б.А. Рыбакова. – М. : Наука, 1976. – С. 228–240.

4. Dejiny Univerzity Karlovy (1347/48–1622) / red. M. Svatos. – Praha : Karolinum, 1995. – 322 c.

5. Album seu Matricula Facultatis juridicae Universitatis Pragensis, ab anno Christi 1372 usque ad annum 1418. – Pragae : Typ. J. Spurny, 1834. – 444 p.

6. Liber decanorum facultatis philosophiae Universitatis Pragensis ab anno Christi 1367 usaque ad annum 1585 : in 2 pars. – Pragae : Typ. J.N. Gerzabek, 1830-1832. – Pars 1. – 1830. – XVI, 452 s.

7. Przyałgowski, W. Zywoty biskupow wilenskich : w 3 t. / W. Przyałgowski. – Petersburg : Druk. J. Ohryzki, 1860. – T. 1. – II, 200 s.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова